ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 6 (962) | АЎТОРАК, 13 красавіка 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПРЫЁМНЫЯ КАМІСІІ РЫХТУЮЦЦА АДЧЫНІЦЬ ДЗВЕРЫ АБІТУРЫЕНТАМ

На базе трох Гродзенскіх ВНУ — універсітэта імя Янкі Купалы, сельскагаспадарчага і медыцынскага інстытутаў — адбыўся рэспубліканскі семінар адказных сакратароў прыёмных камісій, на якім былі абмеркаваны пытанні па арганізацыі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі ў гэтым годзе. Адкрыў семінар першы намеснік міністра адукацыі Барыс Хрусталёў. Ён адзначыў пазітыўныя зрухі ў развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі. У гэтым годзе 42 дзяржаўныя ВНУ адчыняюць дзверы для абітурыентаў па 226 спецыяльнасцях і больш за 1000 спецыялізацыях, чым амаль задаволілі патрэбы ў спецыялістах народнай гаспадаркі рэспублікі. Колькасць студэнтаў у апошні час павялічылася з 189 да 244 тысяч чалавек. З разліку на 10 тысяч жыхароў сёння ў рэспубліцы налічваецца 239 студэнтаў. Па гэтым паказчыку Беларусь блізка падышла да вядучых еўрапейскіх краін: Нідэрландаў, Швецыі, Германіі, Фінляндыі.

("Рэспубліка", № 76)

Рэспубліканскі семінар

## АБ УДАСКАНАЛЬВАННІ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ СА СТУДЭНТАМІ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы Белдзяржуніверсітэта і Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны на базе ГДУ правялі рэспубліканскі семінар "Удасканальванне форм і метадаў інфармацыйнай і выхаваўчай работы са студэнтамі". У ім прынялі ўдзел прарэктары па выхаваўчай рабоце вышэйшых навучальных устаноў краіны, кіруючыя работнікі Міністэрства і абласных упраўленняў адукацыі. У першы дзень работы семінара на пленарным пасяджэнні з прывітальным словам да яго ўдзельнікаў звярнуўся рэктар Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў. Затым былі заслуханы выступленні начальніка Галоўнага ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Г.А.Бутрыма і начальніка Галоўнага ўпраўлення вышэйшай адукацыі В.М.Дабранскага.

Праблемам маральнага выхавання студэнтаў у сучасных умовах быў прысвечаны даклад акадэміка НАН Беларусі загадчыка кафедры педагогікі ГДУ І.Ф.Харламава.

На пленарным пасяджэнні выступілі таксама прарэктары па выхаваўчай рабоце Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога В.В.Кірыенка, Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту — Ю.І.Кулажанка, Гомельскага медыцынскага інстытута — В.М.Раўкова, загадчык кафедры педагогікі вышэйшай школы і сучасных выхаваўчых тэхналогій Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка, доктар педагагічных навук І.І.Цыркун, прарэктар па навуковай рабоце Беларускага недзяржаўнага інстытута фінансаў, кіравання і эканомікі прафесар А.Г.Фурманаў.

Пасля пленарнага пасяджэння ўдзельнікі семінара азнаёміліся з работай універсітэцкага Міжнароднага маладзёжнага фестывальнага цэнтра і экспанатамі выстаўкі сучаснага плаката.

Затым семінар працягваў сваю работу па 2-х секцыях, на якіх было заслухана і абмеркавана звыш 10 дакладаў.

Вечарам для ўдзельнікаў семінара ў актавай зале быў паказаны канцэрт, у якім выступілі народныя калектывы ГДУ.

На наступны дзень удзельнікі семінара азнаёміліся з метадамі і формамі выхаваўчай работы ў Гомельскім тэхнічным універсітэце імя П.О.Сухога і Гомельскім кааператыўным інстытуце, у якім былі падведзены вынікі праведзенай работы і прыняты адпаведныя рэкамендацыі.

Б.ВАЛОДЗІН.

## НА СЕСІІ АКАДЭМІЧНАГА СХОДУ

Вынікі работы Нацыянальнай акадэміі Рэспублікі Беларусь, а таксама яе задачы на сёлета па дакладу прэзідэнта НАНБ А.П.Вайтовіча абмеркаваны ў апошняй дэкадзе сакавіка на сесіі агульнага акадэмічнага сходу.

Сярод выступіўшых з дакладамі на сесіі быў і рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

Прамоўцы адзначалі, што навука, хаця і пацярпела ад эканамічнага крызісу, усё ж здолела ў значнай меры захаваць свае магчымасці.

З вялікай прамовай на сесіі выступіў прэм'ер-міністр краіны С.С.Лінг. Ён заклікаў навукоўцаў падтрымаць намаганні ўрада па ўмацаванню эканомікі і больш сур'ёзную ўвагу ўдзяляць распрацоўкам у галіне сельскай гаспадаркі.

Владимир ИВАНОВ-ВЕВЕРОВСКИЙ,
выпускник геолого-географического факультета

### СПАСИТЕ МИР

*Иерусалимский плач икон,*
*Январский дождь, февральский ветер,*
*Восстал последний Фараон*
*И Сатана расставил сети.*
*Вновь Вашингтона жернова*
*Размалывают кости, души,*
*А речи слаще, чем халва,*
*С телеэкранов хлещут в уши.*
*Вся Югославия — в огне,*
*Славяне гибнут под бомбежкой.*
*Война! Война! А на войне*
*Крадется Смерть блудливой кошкой.*
*Воскресни, Разум! Спесь, умри!*
*Очнитесь же от летаргии,*
*Зажгите мира фонари,*
*Псевдовластители лихие.*

## АБ ПЫВЫШЭННІ РОЛІ НАВУКІ

У Мінску прайшло сумеснае пасяджэнне калегій Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях і рэктарата Белдзяржуніверсітэта. У яго рабоце прынялі ўдзел віцэ-прэм'ер краіны А.В.Замяталін, прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.П.Вайтовіч, міністр адукацыі В.І.Стражаў, старшыня Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях В.А.Гайсёнак, старшыня БелВАКа А.П.Дастанка, рэктар БДУ А.В.Казулін, іншыя адказныя работнікі.

Разгледжаны пытанні "Аб павышэнні ролі навукі вышэйшых навучальных устаноў у вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач рэспублікі" і "Аб канцэпцыі развіцця навукі вышэйшых навучальных устаноў".

У іх абмеркаванні прыняў удзел прарэктар нашага універсітэта па навуковай рабоце доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін.

## АДСВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА

Споўнілася 33 гады, як 4 красавіка было ўстаноўлена прафесійнае свята – Дзень геолага. Урачыста адзначылі яго студэнты і выкладчыкі геолага-геаграфічнага факультэта. Прысутных цёпла павіншаваў дэкан факультэта Г.А.Сербін. У гонар свята былі ўзнагароджаны выдатнікі вучобы і пераможцы рэспубліканскага навуковага конкурсу, студэнты-спартсмены і актывісты факультэта. А КВЗ, які быў праведзены паміж выкладчыкамі і студэнтамі, надоўга запамятаецца сваёй яркай весялосцю і вострым гумарам.

Хроніка

## ЗМЯНЕННІ Ў КІРАЎНІЦТВЕ ФАКУЛЬТЭТАМ

Намеснікам дэкана па вучэбнай рабоце філалагічнага факультэта загадам па універсітэту назначаны дацэнт кафедры беларускай мовы КУЗЬМІЧ Леанід Пятровіч, які раней працаваў намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце.

Загадам па універсітэту намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце гэтага ж факультэта назначаны старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры МАМАЧКІН Дзмітрый Леанідавіч.

## ЗАГАДЧЫКІ НОВЫХ КАФЕДР

Сёлета ва універсітэце адкрыты дзве новыя кафедры: на юрыдычным факультэце — грамадзянска-прававых дысцыплін, на факультэце падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыі — аднайменная кафедра. Загадамі па універсітэту загадчыкам першай з іх назначаны старшы выкладчык ШУЛЕЙКА Сяргей Георгіевіч, другой — ЕЛІСЕЕВА Ірына Міхайлаўна, якая ў гэтым годзе паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара тэхнічных навук.

Размеркаванне маладых спецыялістаў

## ПРАЦОЎНАЯ ДАРОГА — КЛОПАТАЎ МНОГА

Даўно агульнапрызнаным з'яўляецца меркаванне аб тым, што студэнцкія гады — самыя лепшыя ў жыцці маладога чалавека. Хто зведаў іх бесклапотнасць ад сесіі да сесіі, турботы ў час экзаменаў, весялосць у розных культурных мерапрыемствах, той са шчымлівым сумам у душы развітваецца з гэтай прыемнай парой. А што развітанне гэтае ўжо хутка, пяцікурснікі адчулі ў час свайго нядаўняга размеркавання на працу.

Сёлета наш універсітэт падрыхтаваў каля 700 маладых спецыялістаў, з іх для сістэмы народнай адукацыі — больш 400 педагогаў, для вытворчай сферы, розных арганізацый і ўстаноў — каля 300 чалавек.

Педагогі заўсёды былі запатрабаваны грамадствам. Іх чакаюць як школы горада, раённых цэнтраў вобласці, так і на вёсцы. Таму маладыя настаўнікі атрымлівалі накіраванні на працу ў адпаведнасці з планавымі заяўкамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Больш складаная сітуацыя сёння ў вытворчай сферы, у эканоміцы. Многія прадпрыемствы па вядомых прычынах працуюць не на поўную магутнасць, скарачаюцца іх штаты работнікаў. Таму зразумела, што знайсці прымяненне сваім ведам спецыялістам вытворчых прафесій цяпер не зусім лёгка. Аднак універсітэт; выпускаючыя кафедры і самі пяцікурснікі, як кажуць, не сядзелі склаўшы рукі. Работу шукалі агульнымі намаганнямі. Усе заяўкі, якія паступілі ў ГДУ на спецыялістаў вытворчай сферы, задаволены. Астатнія выпускнікі здолелі адшукаць месцы працы ў камерцыйных фірмах, акцыянерных таварыствах і г.д.

Патрэбны кваліфікаваныя педагагічныя кадры і нашаму універсітэту. Сёлета 22 лепшыя выпускнікі размеркаваны на розныя кафедры ГДУ: з іх 5 — на факультэт правазнаўства, 4 — на матфак, 2 — на фізічны факультэт, па філалагічных спецыяльнасці — 11.

Свабоднае размеркаванне атрымалі тыя маладыя спецыялісты, якія маюць на гэта права згодна дзеючага заканадаўства.

Т.НІКАЛАЕВА.

## ТЫДЗЕНЬ ВУЧОБЫ І НОВЫХ ЗНАЁМСТВАЎ



На мінулым тыдні ў нашым універсітэце знаходзілася дэлегацыя, у якую ўваходзілі 6 выкладчыкаў і 26 студэнтаў з французскага Авернькага універсітэта Клермон-Феран-1 на чале з яго віцэ-рэктарам, садырэктарам Франка-Беларускага інстытута кіравання прафесарам Морысам Шэневуа. 5 красавіка госці былі прыняты ў рэктараце ГДУ. На гэтай сустрэчы адбылася двухбаковая зацікаўленая размова.

Па праграме на працягу трох дзён пад кіраўніцтвам выкладчыкаў абодвух універсітэтаў праходзілі дзелавыя гульні нашых і французскіх студэнтаў. У вольны ад заняткаў час апошнія мелі магчымасць азнаёміцца з горадам над Сожам, прыняць удзел у розных культурных мерапрыемствах.

Для французскіх выкладчыкаў і студэнтаў была наладжана сустрэча ў Гомельскім гарвыканкоме.

Б.ВАЛОДЗІН.

## АБ'ЯЎЛЕНЫ КОНКУРС «НАВУКА-99»

Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў аб'явіў конкурс праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў "Навука-99" з мэтай фінансавай падтрымкі творчых навуковых калектываў і асобных вучоных, якія займаюцца вырашэннем актуальных навуковых праблем у інтарэсах эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі.

Заяўкі ў НДС універсітэта прадстаўляць да 1 мая 1999 г.

Даведкі па тэл.57-77-11 (СНТІ НДС).

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры эканомікі кіравання вытворчасцю СКІБАН Ганну Аляксандраўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.*

# ФАКУЛЬТЭТ АДЗНАЧЫЎ ЮБІЛЕЙ

*(АБ РАДАСЦЯХ І ЗАСМУЧЭННЯХ НА ЎРАЧЫСТЫМ СХОДЗЕ)*

У актавай зале нашага універсітэта 27 сакавіка прайшоў юбілейны вечар, прысвечаны 50-годдзю факультэта фізічнай культуры. Яго паўвекавой гісторыі, найбольш значным дасягненням быў прысвечаны даклад дэкана, кандыдата псіхалагічных навук, дацэнта Б.М.Зайцава.

Са знамянальнай падзеяй юбіляраў цёпла павіншавалі рэктар універсітэта член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў і намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкома У.У.Давідовіч, які ўручыў факультэту ў сувязі з юбілеем і дасягнутымі поспехамі Ганаровую грамату абласнога выканаўчага камітэта. Дырэктар Гомельскай абласной школы адзінаборстваў А.У.Хатылёў удастоены Ганаровай граматы абласнога Савета дэпутатаў.

Шматгадовая плённая праца Б.М.Зайцава на пасадзе дэкана адзначана Ганаровай граматай Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Вялікай групе выкладчыкаў факультэта і трэнераў ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны ўзнагароды гарвыканкома, адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля, спартыўных і грамадскіх арганізацый.

А вось што гаварылі на юбілейным вечары выпускнікі факультэта розных гадоў.

**Мікалай СТАРЧАНКА**, выпускнік 1955 года, заслужаны трэнер Беларусі, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (г.Гомель):

— Па заканчэнні інстытута я быў размеркаваны ў СШ №16 нашага горада. Тут адпрацаваў 10 гадоў, а затым яшчэ 22 гады ў СШ № 26. Школы, дзе я выкладаў, заўсёды займалі прызавыя месцы ў горадзе па многіх відах спорту.

Мне вельмі прыемна ў гэты ўрачысты вечар павіншаваць усіх нашых калег — былых студэнтаў, ранейшых і цяперашніх іх выкладчыкаў з юбілейнай датай.

**Віталь КАРНАВУШАНКА**, выпускнік 1961 года, экс-чэмпіён Савецкага Саюза, ганаровы майстар спорту СССР па веславанню на байдарках і каноэ, заслужаны трэнер Беларусі (г.Мінск):

— Лепшыя мае гады — гэта студэнцкія. Як прыемна праз столькі гадоў сустрэць выкладчыкаў, былых студэнтаў, у якіх ужо сталі срэбнымі скроні. Я вельмі рады, што мяне запрасілі на гэты юбілей і з вялікім задавальненнем я тут знаходжуся...

**Ігар ВОЛКАЎ**, доктар біялагічных навук, прафесар, які больш за 15 гадоў загадваў у нашым універсітэце кафедрай лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту (г.Мінск):

— Гады працы ва універсітэце для мяне былі самымі найлепшымі. Мне пашчасціла працаваць пад кіраўніцтвам першага рэктара акадэміка У.А.Белага. Ён выдатна разумеў і разбіраўся ў спорце. Неяк у адной з гутарак з калектывам факультэта Уладзімір Аляксеевіч сказаў: “Нават калі сёння ва універсітэце абароняць 10 доктарскіх дысертацый, пра гэта будуць ведаць нямногія. Калі ж студэнт ГДУ пераможа на чэмпіянаце Еўропы, свету або на Алімпійскіх гульнях, пра гэта адразу даведаецца ўвесь свет”.

За кароткі тэрмін працы ва універсітэце У.А.Белы здолеў вельмі многа зрабіць для ўзняцця спартыўных дасягненняў на больш высокі ўзровень. Працаваць з ім было адно задавальненне...

**Людміла ВАРОНЕЖЦАВА**, метадыст Цэнтра фізічнага выхавання і спорту ўпраўлення адукацыі, выпускніца 1968 года (г.Гомель):

— Зноў пераступіўшы парог універсітэта, маё сэрца забілася пачашчана. Я ўзгадала свае студэнцкія гады, убачыла былых выкладчыкаў. Няхай жыве і развіваецца наш універсітэт. Для мяне ён — самы прыгожы!..

Прыемныя словы юбілярам на вечары чаргаваліся з выступленнямі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці універсітэта і спартсменаў факультэта

Разам з тым нельга прамаўчаць аб тым, пра што гаварылі некаторыя ўдзельнікі вечарыны. У прыватнасці, прысутныя ў зале былі здзіўлены тым, што ў прэзідыум не запрасілі першага выпускніка факультэта, які доўгія гады ўзначальваў кафедру фізічнага выхавання, Валянціна Эдуардавіча Бяляўскага. Дарэчы, у актавай зале ён аказаўся адзіным з 13 першых выпускнікоў факультэта.

Не знайшлося месца ў прэзідыуме і для дырэктара спартклуба універсітэта дацэнта Уладзіміра Лемяшкова, які столькі сіл і ведаў аддае факультэту. Цяпер нават цяжка ўявіць, што Уладзімір Сяргеевіч можа адмовіцца ад гэтай пасады.

Як быццам забыліся запрасіць у прэзідыум і загадчыка кафедры фізвыхавання і спорту, майстра спорту СССР, заслужанага трэнера Беларусі, члена Нацыянальнага алімпійскага камітэта краіны дацэнта Віктара Каляду. І гэта тады, калі на названай кафедры трэніруюцца і паспяхова выступаюць студэнты факультэта фізічнай культуры па 5 (!) відах спорту. Дастаткова нагадаць, што студэнты факультэта, якія спецыялізуюцца па кафедры, маюць на рахунку сярэбраны і бронзавы алімпійскія медалі, медалі чэмпіянатаў свету і Еўропы.

Не знайшлося месца ў юбілейным буклеце ўсё той жа кафедры фізічнага выхавання і спорту, хаця яна амаль поўнасцю ўкамплектавана выпускнікамі факультэта.

Мяркую, што ёсць прычына застацца незадаволеным і дацэнту Аляксею Фяськову, якога ў выступленнях не ўспомнілі, ды і ў буклет упісаць “забыліся”. А трэба нагадаць, што Аляксей Андрэевіч у студэнцкія гады, а пазней і стаўшы выкладчыкам, абараняў гонар студэнцкага таварыства. Ён і цяпер паспяхова выступае на міжнародных спаборніцтвах у групе ветэранаў, прыносіць славу не толькі нашаму універсітэту , але і Беларусі.

Аргкамітэт юбілейнага свята (не зразумела па якіх абставінах) забыўся і пра пяціразовую чэмпіёнку свету па шматбор’ю “Здароўе” Галіну Галаўнёву, якая на працягу многіх гадоў добрасумленна працуе на кафедры фізвыхавання і спорту, трэніруе студэнтаў факультэта фізічнай культуры.

Можна назваць прозвішчы і некаторых іншых выкладчыкаў, пра якіх на юбілейнай урачыстасці нават не ўспомнілі, хаця яны заслужылі добрых слоў.

Гэта не горкі папрок, а шчырае пажаданне, каб такое не паўтарылася, калі будзе адзначацца наступны факультэцкі юбілей.

**Віктар МАРЧАНКА, выпускнік факультэта 1963 года, наш спартыўны аглядальнік.**

# GCSW'99 НАБІРАЕ СІЛУ



На базе матэматычнага факультэта прайшоў трэці штогадовы Тыдзень камп’ютэрных навук GCSW’99 (Gomel Comuter Science Week). Яго асаблівасцю стаў паўнапраўны рэспубліканскі ўзровень, паколькі ў мерапрыемствах GCSW’ 99 у масавым парадку прымалі ўдзел школьнікі, студэнты і аспіранты практычна з усіх абласцей Рэспублікі Беларусь.

Прагама GCSW’99 уключала ў сябе рэспубліканскую навукова-тэхнічную канферэнцыю для студэнтаў і аспірантаў; асабістыя алімпіяды па праграміраванню для школьнікаў, пачынаючых і працягваючых вывучэнне праграміравання; камандную алімпіяду па праграміраванню для школьнікаў, пачынаючых вывучэнне праграміравання; адкрытае каманднае першынство ВНУ рэспублікі (удзельнічалі па 2 каманды ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Гродзенскага і Брэсцкага універсітэтаў, Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту, 5 — ад нашага універсітэта і 8 каманд школьнікаў); завочны і вочны конкурсы па рашэнні шахматных задач; завочны і вочны туры алімпіяды па займальнай матэматыцы; конкурс па праектаванню лічбавых устройстваў, у якім акрамя нашых каманд прымала ўдзел каманда Томскага політэхнічнага інстытута (з дапамогай электроннай пошты).

Ва ўсіх алімпіядах і конкурсах важнай састаўляючай было забеспячэнне аддаленага ўдзелу ў алімпіядах і конкурсах, а ў студэнцкім камандным турніры па праграміраванню ўпершыню ў Рэспубліцы Беларусь было забяспечана аддаленае тэстыраванне ў рэжыме рэальнага часу, г.зн. 2 каманды, якія ў час турніру знаходзіліся непасрэдна ў Мінску і 1 — у Гродна, удзельнічалі так, як і тыя 20 каманд, якія размяшчаліся ў камп’ютэрных класах 2-га і 4-га карпусоў універсітэта.

Другой важнай асаблівасцю алімпіяд была практычна поўная аўтаматызацыя праверкі дасланых рашэнняў для ўсіх конкурсаў і алімпіяд, інакш мерапрыемства такога маштабу проста нельга было б арганізаваць, бо ўсяго ў індывідуальных і камандных спаборніцтвах прыняло ўдзел каля 250 школьнікаў і 40 студэнтаў з усіх абласцей рэспублікі.

Правядзенне гэтага мерапрыемства патрабавала значных намаганняў ад яго арганізатараў. У прыватнасці, уся алімпіядная работа (і перш за ўсё тэстыраванне) не магла б адбыцца без вялікай работы студэнтаў 2-га курса матэматычнага факультэта (гр. ПМ-24) А.Кузняцова і Д.Дзегцярова. Конкурс па праектаванню лічбавых устройстваў падрыхтавалі і арганізавалі аспіранты кафедры матэматычных праблем кіравання А.Федарцоў і В.Літвінаў. Конкурс па рашэнні шахматных задач падрыхтавалі і правялі студэнты 1-га курса матэматычнага факультэта (гр.ПМ-14) Д.Аужын і А.Чаркасаў. Значную частку руціннай арганізацыйнай работы выканаў студэнт 1-га курса фізічнага факультэта М.Кунін. Вельмі важную ролю ў правядзенні GCSW’99 адыграў WWW—сервер ГДУ, які аператыўна насычаўся інфармацыяй для ўдзельнікаў GCSW’99 аспірантам кафедры матэматычных праблем кіравання С.Масько і студэнтам 2-га курса гістарычнага факультэта А.Мурашкам. Падрыхтоўку заданняў і тэстыраванне алімпіяды для пачынаючых ажыццявіў выпускнік матэматычнага факультэта нашага універсітэта, зараз настаўнік інфарматыкі СШ №27 А.Філінскі.

У асабістай алімпіядзе для школьнікаў, якія працягваюць вывучэнне праграміравання, першыя тры месцы занялі адпаведна вучань 10 класа СШ №27 А.Данчанка, дзевяцікласнік СШ № 61 Я.Ганчар і вучань 11 класа СШ № 57 К.Судзілоўскі.

У адкрытым камандным першынстве ВНУ рэспублікі лепшай была каманда Беларускага дзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. На другім месцы каманда гр.ПМ-34 матфака ГДУ ў саставе І.Коршунава, В.Налегача, А.Талкачова (дарэчы, група прызнана лепшай ва універсітэце па выніках атэстацыі). Трэцяй стала каманда матфака ў саставе Д.Аужына (гр.ПМ-14), І.Ганчарэнкі (гр.ПМ-34), К.Судзілоўскага (СШ № 57,11 клас). Як прызёр абласной алімпіяды па інфарматыцы сярод школьнікаў К.Судзілоўскі заваяваў права паступлення на матфак нашага універсітэта без здачы ўступных экзаменаў.

У конкурсе па рашэнні шахматных задач пераможцамі сталі: каманда № 1 СШ № 56, каманда № 3 СШ № 61, каманда № 1 СШ №61.

У конкурсе па праектаванню лічбавых устройстваў лепшымі названы: каманда № 2 матэматычнага факультэта ГДУ (А.Карнейчук, гр.М-33), каманда Томскага політэхнічнага інстытута, каманда № 1 матфака ГДУ.

**М.ДАЛІНСКІ, начальнік ІВЦ ГДУ.**

**Калектывы-юбіляры**

## НЕ ЗГАСАЦЬ РАНІШНЯЙ ЗОРЦЫ



Якім бы складаным, супярэчлівым ні быў сённяшні час, нам дапамагае захаваць у душы светлыя пачуцці мастацтва. Бо яно, як вядома, — катэгорыя вечная. А духоўнай музыцы адводзіцца цяпер асаблівая роля. Яе глыбінная сутнасць дазваляе ўзняцца над зямной мітуснёй і пераканацца, што не ўсё ў жыцці чалавека вымяраецца толькі матэрыяльнымі выгодамі.

Вось ужо на працягу 10 гадоў нясе людзям святло і дабрыню сваім мастацтвам народная харавая капэла ГДУ “Дзянніца”, якой кіруе Мікалай Казлоў. Асноўны творчы напрамак калектыву — духоўная музыка. Не ўсе на пачатку ўспрымалі яе выступленні адназначна, але час сапраўднага яе прызнання ўсё ж настаў. Цяпер капэлу добра ведаюць не толькі за межамі нашай вобласці, рэспублікі, але нават у далёкім замежжы. Так, у Шатландыі, у г.Абердзіне “Дзянніца” выступала ўжо неаднойчы, яна ж з’яўляецца актыўным удзельнікам міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі “Магутны божа”, які праводзіцца ў г.Магілёве, шматлікіх канцэртаў, што праходзяць ва універсітэце, у абласным цэнтры. Шырокая канцэртная дзейнасць калектыву дае яму выдатную магчымасць творчага ўзаемаабагачэння, знаёмства з калегамі па жанру.

“Дзянніца” — юбіляр... За яе плячыма — дзесяцігоддзе, у якім умясціліся многія-многія гадзіны рэпетыцый, пошукаў новага рэпертуару, канцэртных маршрутаў і карпатлівая праца над шліфаваннем выканаўчага майстэрства. І заканамерны вынік гэтага — атрыманае ганаровае званне народнага калектыву яшчэ пяць гадоў таму назад.

У аблдрамтэатры юбіляра цёпла віншавалі нядаўна ўсе яго прыхільнікі, сябры, калегі і жадалі далейшых творчых здабыткаў, каб ніколі не гасла святло “Дзянніцы” — ранішняй зоркі.

**Т.ДУБЯК.**

**Культура**

## СМЕХ УРАТУЕ СВЕТ

З красавіка 1999 года па ліпень 2000-га для папулярызацыі беларускага гумарыстычнага фальклору, які захаваўся ў розных рэгіёнах Беларусі, а таксама для маральнай падтрымкі і заахвочвання мастацкіх калектываў, груп і выканаўцаў твораў сатырычна-гумарыстычнага фальклору праводзіцца фестываль народнага гумару “Аўцюкі-2000”.

Ладзіцца гэтае мерапрыемства агульнымі высілкамі Міністэрства культуры, Беларускага дзіцячага фонду, Гомельскага аблвыканкома і Калінкавіцкага райвыканкома.

Як паведаміў вядучы спецыяліст Міністэрства культуры Віктар Маліноўскі, урачыстае адкрыццё фестывалю адбудзецца ў красавіку 1999-га года ў Мінску і абласных цэнтрах Беларусі, а заключныя мерапрыемствы — у ліпені 2000-га ў Калінкавіцкім раёне ў вёсках Вялікія і Малыя Аўцюкі.

Да ўдзелу ў фестывалі запрашаюцца ўсе вясёлыя ды смяшлівыя, гумарысты ды аптымісты, спевакі, танцоры, артысты і рэжысёры.

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1 КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ НА 1999 ГОД

Ва ўніверсітэт прымаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі; пастаянна пражываючыя на тэрыторыі рэспублікі; беларусы замежжа. Указаныя грамадзяне маюць права на базе сярэдняй адукацыі на конкурснай аснове атрымаць ва ўніверсітэце бясплатную вышэйшую адукацыю, калі адукацыя дадзенага ўзроўню атрымліваецца ўпершыню.

Грамадзяне замежных краін прымаюцца ва ўніверсітэт на аснове дагавораў з аплатай навучання.

Універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў звыш плана прыёму на ўмовах дагавораў з аплатай навучання юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. На месцы звыш плана прыёму, колькасць якіх вызначаецца прыёмнай камісіяй, на конкурснай аснове залічваюцца:

— абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу ва ўніверсітэт;

— абітурыенты, якія маюць накіраванне прадпрыемстваў (арганізацый) і станоўча прайшлі субяседаванне па прадметах уступных экзаменаў.

Субяседаванне праводзіцца **з 12 па 13 жніўня.**

Прыём заяў **з 26 чэрвеня па 15 ліпеня**. Уступныя экзамены **з 16 ліпеня**. Залічэнне ў састаў студэнтаў: па плану — **да 5 жніўня**, на ўмовах аплаты — **да 15 жніўня.**

Паступаючыя ва ўніверсітэт падаюць у прыёмную камісію наступныя дакументы:

— заяву на імя рэктара;
— дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;
— 6 чорна-белых фотаздымкаў памерам 3х4 см;
— медыцынскую даведку па форме 086У;
— выпіску з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе);
— даведку са службы занятасці насельніцтва (для тых, хто знаходзіцца на яе ўліку);
— дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыентаў на льготы, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, або сведчаць аб асабістых талентах і здольнасцях абітурыентаў.

Абітурыенты, якія паступаюць не ў год атрымання сярэдняй адукацыі, абавязаны прадставіць дакументы, што пацвярджаюць іх працу або вучобу за гады, якія папярэднічаюць паступленню (дыплом, выпіску з працоўнай кніжкі, даведку са службы занятасці насельніцтва і інш.).

Пашпарт або іншае пасведчанне асобы, выдадзенае органамі МУС, прад'яўляюцца ў прыёмную камісію абітурыентам асабіста.

Усе ўступныя экзамены з'яўляюцца конкурснымі. Яны (акрамя экзамена па спецфізпадрыхтоўцы) праводзяцца па праграмах, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючу адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца.

Апеляцыі па пытаннях экзаменацыйных адзнак падаюцца адказнаму сакратару прыёмнай камісіі на імя рэктара ў дзень правядзення вуснага экзамена або ў дзень аб'яўлення адзнакі па пісьмоваму экзамену. Паўторная здача экзамена не дазваляецца.

## ПЕРАЛІК УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ:

| Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|
| Руская мова і літаратура<br>Руская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура" | 1. Руская мова (дыктоўка)<br>2. Руская мова і літаратура (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна) |
| Беларуская мова і літаратура | 1. Беларуская мова (дыктоўка)<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна)<br>3. Руская мова і літаратура (вусна) |
| Беларуская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Англійская мова" | 1. Беларуская мова (дыктоўка)<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам)<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна) |
| Англійская мова | 1. Англійская мова (пісьмова)<br>2. Англійская мова (вусна)<br>3. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| Нямецкая мова | 1. Нямецкая мова (пісьмова)<br>2. Нямецкая мова (вусна)<br>3. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| Матэматыка<br>Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт<br>Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве<br>Камерцыйная дзейнасць<br>Фінансы і крэдыт<br>Прыкладная матэматыка | 1. Матэматыка (вусна)<br>2. Матэматыка (пісьмова)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Фізіка (вытворчае і педагагічнае аддзяленні)<br>Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць"<br>Фізічная электроніка<br>Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі<br>Геалогія і разведка карысных выкапняў | 1. Фізіка (вусна)<br>2. Матэматыка (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Гісторыя | 1. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" | 1. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| Правазнаўства | 1. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>2. Сусветная гісторыя (вусна)<br>3. Замежная мова (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| Геаграфія | 1. Геаграфія (вусна)<br>2. Матэматыка (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Экалогія | 1. Геаграфія (вусна)<br>2. Матэматыка (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Псіхалогія | 1. Матэматыка (вусна)<br>2. Біялогія (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Біялогія | 1. Біялогія (вусна)<br>2. Хімія (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |
| Фізічная культура і спорт | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы<br>2. Біялогія (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (пераказ) |

Залічэнне на ўсе спецыяльнасці, акрамя спецыяльнасцей, па якіх ажыццяўляецца мэтавая кантрактная падрыхтоўка, праводзіцца па асобнаму конкурсу сярод выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ прапарцыянальна па дадзеных заявах у адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных экзаменах. У тых выпадках, калі конкурсны бал сярод выпускнікоў сельскіх школ перавышае конкурсны бал сярод выпускнікоў гарадскіх школ, залічэнне праводзіцца па агульнаму конкурсу.

Конкурс праводзіцца па спецыяльнасцях, акрамя спецыяльнасці "Фізіка", дзе конкурс праводзіцца па аддзяленнях.

Выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення пры ўніверсітэце залічваюцца ў адпаведнасці з "Палажэннем аб падрыхтоўчым аддзяленні пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны". Асобы, якія прайшлі навучанне праз іншыя формы давузаўскай падрыхтоўкі пры ўніверсітэце, залічваюцца на агульных падставах.

Без уступных экзаменаў залічваюцца:

а) пераможцы (I, II, III месцы) міжнародных, рэспубліканскіх і гомельскіх абласных алімпіяд выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1998-1999 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

б) пераможцы (I, II, III месцы) Гомельскай гарадской алімпіяды па інфарматыцы пры паступленні на спецыяльнасць "Прыкладаная матэматыка";

в) пераможцы (дыплом I ступені) універсітэцкіх алімпіяд па матэматыцы, фізіцы і біялогіі пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

г) пераможцы абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў па тэхнічнай творчасці пры паступленні на спецыяльнасць "Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць".

Асобы, якія закончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай:

а) пры паступленні на спецыяльнасці "Матэматыка", "Фізіка", "Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць", "Геалогія і разведка карысных выкапняў", "Біялогія" залічваюцца пасля здачы ўступнага экзамена па прафілірующай дысцыпліне (указана ў пераліку ўступных экзаменаў першай) на адзнаку "5", а пры атрыманні другой станоўчай адзнакі здаюць астатнія ўступныя экзамены і ўдзельнічаюць у агульным конкурсе;

б) пры паступленні на іншыя спецыяльнасці здаюць усе ўступныя экзамены.

Правамі медалістаў карыстаюцца пераможцы (дыплом II ступені) універсітэцкіх алімпіяд па фізіцы, матэматыцы і біялогіі, а таксама ўдзельнікі Гомельскіх абласных алімпіяд па фізіцы, матэматыцы і біялогіі, занятых 4-10 месцы, пры паступленні на спецыяльнасці "Матэматыка", "Фізіка", "Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць", "Біялогія".

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

— воіны-інтэрнацыяналісты;
— круглыя сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;
— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых або рабочых і служачых, якія займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, загінуўшых (памёршых) або стаўшых інвалідамі ў час праходжання воінскай службы або работы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры праходжанні воінскай службы;
— дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памёршых) або стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама загінуўшых (памёршых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;
— інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;
— асобы, якія маюць льготы ў адпаведнасці з арт.18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС". Абітурыентам гэтай катэгорыі,

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1 КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ НА 1999 ГОД

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

якія закончылі навучальныя ўстановы з адзнакай (з выдатнымі адзнакамі) залічваюцца па выніках субяседавання. Субяседаванне праводзіцца **13 ліпеня** па прадметах, якія выносяцца на экзамены;

— суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх арганізацый і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

Пры роўнасці конкурсных балаў перавагу маюць:

— інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

— зволеныя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

— асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў;

— медалісты сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў, выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на аснове базавай школы, а таксама выдатнікі ПТВ на аснове сярэдняй школы пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманым прафесіям;

— прафесійна арыентаваныя абітурыенты (закончылі факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, маюць стаж работы па спецыяльнасці, якая адпавядае абранай, або іншую прафесійную арыентацыю).

Універсітэт ажыццяўляе мэтавы кантрактны прыём. Залічэнне абітурыентаў на ўмовах мэтавай кантрактнай падрыхтоўкі спецыялістаў ажыццяўляецца па асобнаму конкурсу згодна даведзеных планаў мэтавага кантрактнага прыёму і адпаведных палажэнняў. Залічэнне выпускнікоў Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Добрушскага, Ельскага, Кармянскага, Лельчыцкага, Нараўлянскага, Хойніцкага, Чачэрскага раёнаў, узнагароджаных залатым або сярэбраным медалём і паступаючых ва універсітэт на педагагічныя спецыяльнасці на ўмовах мэтавага кантрактнага прыёму, ажыццяўляецца па выніках субяседавання. Субяседаванне праводзіцца **з 13 па 14 ліпеня.**

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі прымаюцца асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання. Парадак залічэння гэтых асоб вызначаецца адпаведным палажэннем.

Усе іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй універсітэта на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь і "Парадку прыёму ў дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1999 год".

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, прыёмная камісія. Тэлефоны: 57-69-17 (адказны сакратар), 56-73-38 (прыёмная камісія).

## ЭКЗАМЕНЫ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

Выходным палажэннем экзаменаў па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з'яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай падрыхтаванасці і рухальнага апарату абітурыентаў.

Здача экзаменаў пачынаецца з дыферэнцыраванага заліку па плаванню і пры паспяховай яго здачы абітурыенты працягваюць здаваць экзамен па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы. Ён уключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор'я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з існуючымі правіламі спаборніцтваў.

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах (гл. табліцу). У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні да заліку па плаванню. Дыстанцыю можна праплыць адным з існуючых стыляў плавання, прадугледжаных спартыўнай класіфікацыяй.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор'я ніжэй заліковага ацэньваецца двума ("2") баламі, якія не з'яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор'і :

ад 18 да 20 балаў — 5 (выдатна);
ад 14 да 17 балаў — 4 (добра);
ад 10 да 13 балаў — 3 (здавальняюча).

Адзнака дыферэнцыраванага заліку па плаванню будзе ўлічвацца ў конкурснай сітуацыі пры залічэнні ў студэнты.

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка. | | | | | | | |
| Бег 100 м (сек) | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0. | 17.0 |
| Бег 1000м (мін, сек) | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.20 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35. | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| Кіданне гранаты (м) | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху (колькасць разоў) | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| Згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы (згібанне рук не менш 90°, колькасць разоў) | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м (мін, сек) вольны стыль | 17-29 | 1.32 | 1.47 | 2.02 | 1.38 | 1.53 | 2.08 |
| | 30 і болей | 1.42 | 1.57 | 2.12 | 1.48 | 2.03 | 2.18 |
| брас | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.13 | 2.28 | 2.43 |
| кроль на спіне | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 1.53 | 2.08 | 2.23 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |

**Учора ў нашай краіне і краінах СНД адзначаўся Дзень касманаўтыкі**

# БЕЛАРУСКІЯ НАЗВЫ Ў КОСМАСЕ

Астраномія, як і любая навука, не належыць адной ці некалькім нацыям або дзяржавам. Да таго ж, гэта гісторыя і культура ўсёй чалавечай цывілізацыі. Свой уклад у яе развіццё ўнеслі і беларусы.

У сувязі з гэтым можна, канешне, успомніць знакамітыя паэмы "Тарас на Парнасе" і "Энеіда навыварат", дзе ананімны аўтар (або аўтары) выкарыстоўваюць вобразы антычнай міфалогіі — старажытнагрэчаскіх і рымскіх багоў, імёнамі якіх названы сузор'і, планеты і іх спадарожнікі, астэроіды. Напрыклад: Геркулес, Венера, Марс, Юпітэр (Зеўс), Сатурн, Нептун, Геба, Юнона, Веста..., народныя песні, "Зорка Венера" Максіма Багдановіча і іншыя творы.

Але ж у беларускай мове існуюць так званыя астронімы — узнікшыя стагоддзі назад народныя назвы зорак, сузор'яў і некаторых нябесных з'яў. Так, усім вядомую Вялікую Мядзведзіцу нашы далёкія продкі называлі Вялікім Вазом, Ласём, або проста Сахатым. Сузор'е Касіяпеі — Касьбітамі, або Касцамі, рассеянае зорнае скопішча Плеяды — Сітам, або Качыным гняздом, пояс Арыёна атрымаў назвы Кічыгі і Тры сястры, Млечны шлях звалі Вайсковым станам або птушыным шляхам, Венеру — Мілавіцай, або зоркай Чагір, метэоры — знічкамі... Можа нашы чытачы ведаюць і іншыя астронімы?

Аднак гісторыя — гэта не толькі старажытны час. Некаторыя беларускія назвы ў космасе з'явіліся 100, 50, а то і 10 гадоў назад і былі ўзаконены Міжнародным астранамічным саюзам. Так, па прапанове іх першаадкрывальнікаў Міжнародным планетным цэнтрам у Кембрыджы (ЗША) малым планетам астэроідам прысвоены назвы Беларусь, Мінск, Хатынь, Брэст і іншыя, звязаныя з гісторыяй нашай рэспублікі. Гэта Лясная (у гонар перамогі рускіх войскаў Пятра I над шведскімі 28 верасня 1708 года пад вёскай Лясная (цяпер Слаўгарадскі раён), Блажко (Сяргей Мікалаевіч Блажко), Цераскія (Вітольд Карлавіч Цераскі), Ота Шміт (Ота Юльевіч Шміт); апошнія тры — у гонар выдатных вучоных, якія нарадзіліся на тэрыторыі Беларусі: Алегія — у гонар ураджэнца Беларусі, вядомага папулярызатара астраноміі Алега Мікалаевіча Коратцава, Шагал — у гонар вядомага мастака Марка Шагала, які нарадзіўся ў Віцебску.

Дарэчы, імёнамі (прозвішчамі) сусветна вядомых астраномаў, якія нарадзіліся на тэрыторыі Беларусі, — С.М.Блажко, І.У.Гаўрылава, Ю.Н.Ліпскага, В.К.Цераскага названы кратэры на Месяцы, а ў гонар жонкі апошняга (яны разам з мужам адкрылі 219 пераменных зорак) кратэр на Венеры атрымаў назву Цераскія. Імёны (прозвішчы) Г.А.Ціхава і О.Ю.Шміта ўвекавечаны не толькі на Месяцы, але і на Марсе!

У "Метэарытны каталог свету" унесены назвы метэарытаў, якія ўпалі на тэрыторыі Беларусі. У іх ліку і наш "Брагін", "Заброддзе"(Стаўбцоўскі раён), "Жмень"(Столінскі раён), "Чорны бор" (Быхаўскі раён), "Грэск" (Слуцкі раён). З прыведзенымі вышэй назвамі пераклікаецца выраз "Лагойская астраблема" — буйная кальцавая структура, што ўзнікла, як мяркуюць, у выніку падзення астэроіда (малой планеты) 40-45 мільёнаў гадоў назад.

Яшчэ хацелася б падкрэсліць значэнне назвы "Камяні" для ўсяго навуковага свету. Дадзеныя, якія ўжо ёсць у распараджэнні вучоных, могуць сведчыць аб тым, што на Полаччыне існавала старажытная абсерваторыя, падобная на "Стоўнхендж". Ужо тады — у X-XII стагоддзях — нашы далёкія продкі, відаць, праводзілі астранамічныя назіранні, з дапамогай якіх вызначалі пачатак зімы, вясны, лета, пачатак і канец года, а можа і іншыя астранамічныя з'явы. Як бачыце, існуе даволі трывалая сувязь паміж адной з самых старажытных навук і гісторыяй, культурай Беларусі.

**Уладзімір ЛАРЫЁНАЎ,**
**выпускнік філалагічнага факультэта ГДУ 1985 г.**

**Для любителей шахмат**

# 5 МИНУТ НА ДИАГРАММУ

1.
**А.КОНОНОВ — А.САВЕНОК**
Заочный турнир ЦШК СССР 1991
**Белые**: Kph1, Фc2, Лf1, Cb1, Cc1, пп. a2, b3, c4, e5, g2, h2 (11)
**Черные**: Kpg8, Фg4, Лd7, Cb7, Cc5, пп. a7, b6, e6, f7, g6 (10)
В этом окончании ход черных, найдите сильнейшее продолжение.

2.
**Белые**: Kpb8, Фc2, Ca2, Ke8, пп. d6, e7, h6 (7)
**Черные**: Kpd8, Лh8, Лf4, Cc4, Ca1, пп. c3, g6, h7 (8)
Мат в три хода.

3.
**Белые**: Kpb6,Лc6, пп. d2, f2, f3, f4, f5, f6, g6, h6 (10)
**Черные**: Kpg4, пп. d3, d5, d6, (4)
Мат в четыре хода.

4.
**Белые**: Kpc6, Фf3, Лh7, Kb3, Kg4 (5)
**Черные**: Kpg1, Cb8, Kg2, пп. b4, c3, d3, e3, f2, g7 (9)
Выигрыш.

Во всех композициях начинают белые.



3) Мат в 4 хода



4) Выигрыш

**Александр САВЕНОК; мастер (ICCF), кандидат физико-математических наук (автор композиций).**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— тэорыі і практыкі англійскай мовы — выкладчыка (3);
— беларускай культуры — асістэнта (2);
— педагогікі — асістэнта;
— вышэйшай матэматыкі — асістэнта;
— батанікі і фізіялогіі раслін — асістэнта;
— матэматычнага аналізу — асістэнта;
— ВМ і праграміравання — асістэнта;
— фізічнага выхавання і спорту — выкладчыка;
— экалогіі — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты юрыдычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дэкану юрфака **КЛЮЧНІКАВУ Юрыю Андрэевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 166.
Падпісана да друку 9.04.1999 г.